# Больш паўгадавога

На добрым месцы размешчана свінаферма калгаса «Чырвоны маяк». Жывёлагадоўчыя памяшканні з трох бакоў акружаны густым хмызняком розных відаў. А ў сярэдзіне іх, з паўднёвага і паўднёва-заходняга боку маюцца выпасы, багатыя разнатраўем. Ёсць тут і вадапой.

На тэрыторыі фермы заўсёды суха і ўтульна, бо пабудовы размешчаны на ўзвышшы, да якога з усходне-паўднёвага боку падыходзіць дарога, якая звязвае ферму з цэнтрам калгаса. Па ёй штодзённа крочаць да гадаванцаў жывёлаводы, каб своечасова накарміць і дагледзіць іх. У цяперашні час на ферме ўтрымліваецца больш як 530 галоў свіней рознага ўзросту. Даглядаюць жа іх сем свінарак, большасць з вёлаводы добра ведаюць звычаі і павадкі свіней рознага ўзросту, які пад ыход трэба мець да іх, або якія кармы і ў якую пару года лепш скармліваць свінаматкам, рамонтнікам, маладняку або адкормачнікам. Таму і абавязацельствы свінаводы заўсёды выконваюць. Прыкладам гэтаму можа служыць датэрміновае выкананне паўгадавога плана продажу дзяржаве свініны.

Свінаркі, якія працуюць на адкорме свіней, у юбілейным годзе абавязаліся прадаць дзяржаве 285 цэнтнераў свініны, а за паўгоддзе — 248 цнт.

З выкананнем прынятых абавязацельстваў, жывёлаводы спраўляюцца паспяхова. За чатыры месяцы сёлетняга года са свінафермы на прыёмныя пункты было адпраўлена і здадзена дзяржаве 187 га-

Такім чынам, паўгадавое заданне па продажу свініны дзяржаве за пяць месяцаў будзе выканана на 100,4 працэнта.

Вялікі ўклад у справу выканання плана зрабілі свінаркі Марыя Дзям'янаўна Дарашэнка і Марыя Аляксееўна Кокатава. Ад групы, якую адкормлівае Марыя Дарашэнка, здадзена дзяржаве 52 галавы свіней, жывая вага кожнай у сярэднім 106 кілаграмаў. Прадукцыя, атрыманая яе рукамі, складае 28 працэнтаў ад агульнай, якую дзяржава атрымала ад свінафермы. Цяпер Дзям'янаўна даглядае 6 галоў адкормачнікаў і рамонтны маладняк.

А за Марыяй Аляксееўнай у цяперашні час замацаваны 68 галоў адкормачнікаў. У хуткім часе закончацца тэрміны іх адкорму і яны будуць адпраўлены на прыёмныя

якіх мае дванаццацігадовы або дзесяцігадовы стаж работы на ферме, што станоўча адбіваецца на развіцці свінагадоўлі і росце яго прадуктыўнасці. Жылоў свіней агульнай вагой 200 цэнтнераў. Кожная галава — больш 100 кілаграмаў. Учора на прыёмны пункт адправілі яшчэ каля 50 цэнтнераў свініны.

пункты. Гэта будзе яшчэ адзін крок да выканання плана продажу свініны дзяржаве.

**А. КАСТРОЎ,**
**учотчык фермы.**

**Кастроў, А.** Больш паўгадавога / А. Кастроў // Шлях Кастрычніка.
*Выкананне плана продажу свініны дзяржаве працаўнікамі свінафермы калгаса “Чырвоны маяк”.*